**Храпавіцкая, Н.** На полі квітнеюць чырвоныя макі, а ў гарах — снег / Н. Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2020. — 14 лют. — С. 3.

## НА ПОЛІ КВІТНЕЮЦЬ ЧЫРВОНЫЯ МАКІ, А Ў ГАРАХ — СНЕГ


Алег Аўсянік падчас службы.


Сям'я Аўсянікаў.

У 1989 годзе адбыўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана. Гэта дата сімвалічная. У ёй аб'яднаны вернасць прысязе, службоваму абавязку, франтавое братэрства салдатаў і афіцэраў, якія аддалі, абараняючы інтарэсы сваёй краіны, самае дарагое на зямлі – жыццё. «Гарачыя кропкі» назаўжды сталі болем для многіх родных і блізкіх герояў. На вялікі жаль, з кожным годам удзельнікаў той жудаснай падзеі становіцца ўсё менш. Даюць пра сябе ведаць узрост, былыя раны і хваробы.

Давялося пазнаёміцца з лепяльчанінам, які таксама праходзіў тэрміновую службу далёка ад сваёй радзімы – у горадзе Шындант рэспублікі Афганістан. Наўрад ці задумваўся ў дзяцінстве вясковы хлопец пра тое, што пэўны час правядзе ў гэтай краіне.

Алег Аўсянік нарадзіўся ў 1966 годзе ў вёсцы Зялёны Востраў. Жыў з бабуляй, якая ў асноўным і займалася яго выхаваннем. Дзіцячыя гады, як кажа мой суразмоўца, былі шчаслівыя. На ўлонні прыроды хлопчыкі знаходзілі розныя забавы. Побач – лес, таму без грыбоў не заставаўся ні адзін вясковец. Пры любой магчымасці Алег з сябрамі сядзеў з вудай на рэчцы Старобінцы. І сучасныя прынады былі не патрэбны, рыба добра лавілася і на драўняную вуду. Лепшай жа лічылася – зробленая з ляшчыны.

Зімой праходзілі сапраўдныя баталіі па хакеі сярод вясковых хлопцаў. Спачатку нават здзівілася, адкуль у іх былі канькі.

– Якія канькі?! Гулялі ў простых валёнках ці ботах. З лазняку кожны сабе майстраваў клюшкі. Шайба ўвогуле была драўняная і не заўсёды круглая па форме. Спачатку гуртам чысцілі пляцоўку, а потым на ёй гулялі рознаўзроставыя каманды. І ўсё гэта не перашкаджала бавіць час з карысцю і вялікай цікавасцю.

Нават мабільныя тэлефоны не патрэбны былі каб сабрацца ўсім разам. Дзяцей клікала да сябе прырода, хоць і не заўседы яна была прыдатная для забаў. Купаліся болыш у сажалках. Аднак калі ў хлопцаў з'явіліся веласіпеды, яны сталі наведваць вёску Азерцы, што знаходзілася за пяць-шэсць кіламетраў ад Зялёнага Вострава. І ўжо там, на маляўнічым возеры можна было адпачыць і целам, і душой. Нават з іншых раёнаў рыбакі, ды і проста адпачывальнікі, наведваюць гэтыя мясціны з-за іх прыгажосці.

Асабліва падабалася хлопцам збірацца на высокай Панавай гары, з якой зімой каталіся на лыжах і санках.

Дашкольныя ўстановы вясковыя дзеці ў асноўным не наведвалі. А вось пра Зялёнаастраўскую васьмігадовую школу Алег Мікалаевіч узгадвае з цеплынёй. Вельмі любіў чытаць, таму літаратура і гісторыя ў школе былі любімымі прадметамі. Так атрымлівалася, што кніжкі ў асноўным трапляліся ў рукі на тэму вайны, таму пра гэты перыяд у гісторыі мог распавядаць гадзінамі. У класе было чатырнаццаць чалавек, што для сельскай мясцовасці мала. Увогуле, вёска ў савецкія часы была густанаселенай. Цяпер ужо і будынка таго няма, аднак успамінаў засталося шмат. Толькі школьны

сад да гэтага часу вясной прываблівае погляд вяскоўцаў ружовай квеценню. У ранейшыя часы яблыні ўвогуле былі паўсюдна. Ва ўсіх калгасах былі ўласныя дрэвы.

Каля школы былі таксама градкі, на якіх працавалі і дзеці падчас праходжання практыкі. Дзякуючы такому прысядзібнаму надзелу ў сталовай для школьнікаў заўсёды былі свежыя гародніна і садавіна, толькі карысная ежа на абед.

Даводзілася Алегу Мікалаевічу працаваць і дома, бо ў гаспадарцы Аўсянікаў былі карова, свінні і куры. Нарыхтаваць для рагулі сена – абавязак унука. А хочацца ж і пагуляць у юнацкія гады. Так і атрымлівалася, што, павесяліўшыся на танцах, тут жа ішлі на сенакос. Аднак ад гэтага ўспаміны не сталі сумнымі. Жыццё здавалася яшчэ больш рамантычным. Сябры дапамагалі адзін аднаму касіць сена, пілаваць, секчы дровы, а таксама ў іншых справах.

Працоўную дзейнасць Алег Мікалаевіч пачаў у пачатку 1980-х гадоў у мясцовым калгасе «Ударнік» у будаўнічай брыгадзе. Акрамя гэтага, ад райваенкамата скончыў Лепельскую аўташколу ДТСААФ. Тут і атрымаў права кіравання аўтатранспартам катэгорыі «С».

Ва Узброеныя Сілы СССР хлопец быў прызваны 15 красавіка 1986 года. Усяго некалькі дзён у Печах, а потым паўгода знаходзіўся ў Батумі Аджарскай ССР, дзе прайшоў паглыбленую падрыхтоўку байца ва ўчэбцы. У Афганістан трапіў у кастрычніку 1986 года, дзе служыў у 1060-м артылерыйскім палку.

Кажуць, што з часам дрэнныя ўспаміны знікаюць, а застаюцца толькі добрыя. Так і старшы сяржант, камандзір аддзялення Алег Аўсянік лічыць, што Афганістан – прыгожая краіна.

– Быў прызваны на вайсковую службу амаль у 20 гадоў. Магчыма, таму страху не адчуваў. Таксама для сябе ўзяў за правіла дакладна выконваць каманды старшых па званні, – адказвае на маё пытанне пра жахі тых падзей Алег Мікалаевіч.

...Чырвонае поле макаў унізе, а ў гарах – снег ляжыць... Такіх кантрастаў і маляўнічасці больш нідзе не даводзілася бачыць майму суразмоўцу. За рулём вялікага «Урала», на якім вазіў людзей, розныя грузы і нават снарады, пазнаў дарожныя серпанціны. Калонамі з незлічонай колькасцю машын пабываў у такіх гарадах, як Шындант, Кандагар і іншых.

Аднойчы ў браніраванай машыне з Алегам Мікалаевічам ехаў старшы камсамолец палка, і падчас руху калоны пачалася перастрэлка. Пасля гэтай камандзіроўкі Алегу Аўсяніку далі вышэйшую ўзнагароду камсамола. Таксама ўзнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Яго атрымаў за ўмелыя, ініцыятыўныя і смелыя дзеянні, якія звязаны з рызыкай для жыцця і садзейнічаюць поспеху баявых дзеянняў з ворагамі Савецкай дзяржавы.

Вярнуўся на радзіму Алег Мікалаевіч 21 чэрвеня 1988 года. На працягу ўсяго часу, пакуль знаходзіўся ў Афганістане, бабуля лічыла, што яе ўнук праходзіць тарміновую службу ў Манголіі. І толькі калі вярнуўся дадому, сусед прачытаў у дакументах пра сапраўднае месца службы. Канечне, слёзы ў родных былі, але ўжо ад радасці.

З будучай жонкай Алег Мікалаевіч пазнаёміўся на вяселлі сябра, таксама афганца. Некалькі гадоў сустракаліся, а ў 1992 годзе згулялі ўласнае вяселле.

Пэўны час галава сям'і працаваў на заводзе шасцерань токарам-шматстаночнікам, потым – у Валосавіцкім лясніцтве, на водаканалізацыйным участку КУВП ЖКГ «Лепель». Цяпер рупіцца кіроўцам у ДЛГУ «Лепельскі лясгас».

Шчаслівыя бацькі выгадавалі дваіх дзяцей. Сын Арцём працуе ў Лепельскім РАУС, мае званне старшага лейтэнанта міліцыі, дачка Ганна набывае прафесію юрыста ў Віцебскім міжнародным універсітэце «МІПСА».

У вольны час сям'я збіраецца ў роднай хаце ў вёсцы Зялёны Востраў. Тут расце садавіна і гародніна, ёсць лазня, а побач з ёй – сажалка з рыбай і ракамі. Няма лепшага месца адпачынку для Алега Мікалаевіча. Гаспадар любіць завэндзіць рыбку, якой потым частуе ўсю сям'ю пасля моцнай пары...

**Наталля ХРАПАВІЦКАЯ**